Эта история еще раз показывает, что мы плохо представляем сложные социальные и этноконфесиинональные отношения в средневековом обществе, а также мотивацию поступков людей того времени, которые имели совершенно иную логику, нежели в настоящее время. Несмотря на исключительность юридического прецедента, связанного с идентификацией личности крестьян целой деревни, мы можем свидетельствовать, что в ходе разбирательства был выработан достаточно эффективный механизм. Сначала был установлен сам факт существования «пропавших» Жикгоренцев на основании предыдущих пожалований великих князей литовских Александра и Жигимонта Старого, затем фактически была проведена очная ставка «потерпевших» татарских князей Абрагимовичей-Юшинских с «подозреваемыми» Кутовтовичами, а также учинен допрос последних на предмет установления их родства с «пропавшими» Жикгоренцами. Для полного восстановления «картины преступления» господарские комиссары выехали на «местопреступления», где опросили свидетелей, лично знавших и «пропавших», и «подозреваемых», и «потерпевших» из числа шляхты Троцкого повета.

**Список использованных источников**


1. *Davis, N. Z.* The Return of Martin Guerre / N. Z. Davis. – Cambridge: Harvard University Press, 1983. – 176 p.

2. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1997. – Kn. 10 (1440–1523) / parengė E. Banionis ir A. Baliulis. – 179 p.

3. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1997. – Kn. 11 (1518–1523) / parengė A. Dubonis. – 228 p.

4. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2011. – Kn. 7 (1506–1539) / parengė I. Ilarienė, L. Karalius, D. Antanavičus. – 1012 p.

5. *Менжинский, В. С.* Документальный состав Книг записей Литовской Метрики за 1522–1552 гг. / В. С. Менжинский // Литовская метрика. Исследования 1988 г.: сб. ст. / сост. Э. Банионис, З. Кяупа. – Вильнюс: Academia, 1992. – С. 46–70.

6. *Wolff, J.* Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1895. – 670 s.

7. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2009. – Kn. 19 (1535–1537) / parengė D. Vilimas. – 362 p.

8. *Лазутка, С.* Первый Литовский Статут (1529 г.) / С. Лазутка, И. Валиконите, Э. Гудавичус. – Вильнюс: Margi raštai, 2004. – 522 с.



*А. У. Любы*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*A. U. Liuby*
Belarusian State University, Minsk



**УДК 930**


## ЯГЕЛОНІКА XXI СТАГОДДЗЯ: МАКРАПРАЕКТЫ ПА ГІСТОРЫІ ДЫНАСТЫІ І РЭГІЁНА Ў ЕЎРАПЕЙСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ



## JAGIELLONICA XXI CENTURY: MACROPROJECTS ON THE HISTORY OF THE DYNASTY AND THE REGION IN THE EUROPEAN HISTORIOGRAPHY


*Артыкул прысвечаны гісторыі вывучэння ў пачатку XXI в. дынастыі Ягелонаў: палітычным, эканамічным і культурным пераўтварэнням у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў канцы Сярэднявечча – пачатку Новага часу. Разглядаюцца такія навуковыя цэнтры, як Варшава, Лейпцыг и Оксфард, і іх макрапраекты, прысвечаныя часу кіравання Ягелонаў у дзяржавах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Адзначаюцца станоўчыя і адмоўныя бакі ў падобных даследаваннях, ацэньваецца індывідуальны ўклад і калектыўная папулярызацыя культурнай спадчыны Ягелонаў на сучасным этапе.*



*Ключавыя словы: дынастыя Ягелонаў; Цэнтральная і Усходняя Еўропа; гістарычная памяць; цэнтральнаеўрапейская і заходнееўрапейская гістарыяграфія.*



*The article deals with a history of the Jagiellons dynasty investigation at the beginning of the XXI centuries: political, economical and cultural changing taken place in Central and Eastern Europe at the end of Middle Age – early Modern Times. The object of the study is such scientific centers as Warsaw, Leipzig and Oxford (macro projects concerning Jagiellons' ruling period in the Central and Eastern Europe). Positive and negative sides of the same project are analyses in the article. The author gives estimation an individual and collective contribution in to popularization of the Jagiellons cultural heritage at the present time.*



*Key words: Jagiellons dynasty; Central and Eastern Europe; historical memory; Central and Western European historiography*


Даследаванне эпохі Ягелонаў, якое з новай сілай распачалося ў сучасных цэнтральна- і ўсходнееўрапейскіх гістарыяграфіях пасля 1989 г., да сённяшняга дня памяняла некалькі кірункаў дыскурсаў і пашырыла праблемнае поле, акрэсленае даследчыкамі XX ст. Папярэдняя эпоха дазволіла сфармуляваць такія базавыя паняцці, як «Ягелонская ідэя» (Оскар Халецкі) і «Эпоха Ягелонаў» (Аляксандр Гейштар), «залаты век» і інш. Пераважна, гэтыя распрацоўкі былі звязаны з польскай, венгерскай і чэшскай нацыянальнымі гістарыяграфіямі, што, безумоўна, залежыла ад пераасэнсавання месца і ролі дзяржаўнасцяў гэтых нацый у рэгіёне ў пачатку Новага часу.

Вялікая роля ў абуджэнні цікаўнасці да праблематыкі развіцця дынастыі і культуры эпохі Ягелонаў звязана з пераглядам іх палітычнай спадчыны ў XV ст. і XVI ст., сістэматызацыяй звестак па дыпламатыі, дынастычнай стратэгіі, генеалогіі, інтэлектуальнай гісторыі, гісторыі штодзённасці і макрагісторыі, кірункаў у метадалогіі, якія развіваюцца ў гістарычнай навуцы ў канцы XX ст.

Заходнееўрапейская гістарыяграфія пачынае зазіраць у «ягелонскую» праблематыку пераважна дзякуючы актыўнай папулярнасці міждынастычнай кампаратывістыкі. Менавіта прадстаўнікі польска-літвінскай дынастыі Ягелонаў супрацьпастаўляюцца аўстрыйскім Габсбургам, а ўжо ў пачатку XXI ст. пафасна называюцца «Цюдарамі Цэнтральнай Еўропы» («Tudors of Central Europe») [18].

Усходнееўрапейская гістарыяграфія дастаткова стрымана аднеслася да ідэі макрагістарычнага кампаратыва і ў 1990-я гг., і напачатку XXI ст.

Расійская гістарыяграфія, захопленая юбілеямі дынастыі Раманавых, выключыла з нацыянальнага наратыва міждынастычныя адносіны папярэдніх эпох (напрыклад, шлюб княгіні Алёны Іванаўны, дачкі вялікага князя маскоўскага Івана ІІІ, і прадстаўніка дынастыі Ягелонаў – вялікага князя літоўскага Аляксандра). Гісторыя адносінаў з дзяржавамі, якімі кіравалі Ягелоны, у сучаснай расійскай гістарыяграфіі пераважна разглядаецца ў праблемным полі ваеннай гісторыі (маскоўска-літвінскія войны канца XV – першай паловы XVI ст., Інфлянцкая, Лівонская войны, асобныя бітвы, як бітва пад Оршай 1514 г., і г. д.). «ВКЛістыка» ўваходзіць у сваю новую, дастаткова запатрабаваную ў сучасных геапалітычных рэаліях, фазу развіцця ў расійскай гістарычнай навуцы XXI ст., пакуль што створанай пераважна «рукамі» нерасійскіх даследчыкаў [1], вельмі перспектыўнай, але пазбаўленай «ягелонскай» афарбоўкі.

Нацыянальныя гістарыяграфіі Беларусі, Літвы і Украіны на сёння маюць больш дакладную задачу па ставарэнні нацыянальнага гістарычнага наратыва. Папярэдняя постсавецкая «рамантычная» гістарыяграфія не пакінула істотнага ўласнага асэнсавання эпохі Ягелонаў для гісторыі зямель трох сучасных незалежных рэспублік. Уключэнне эпохі адной манаршай дынастыі было праігнаравана ў перыядызацыях гістарычных працэсаў як у нацыянальным, так і сацыялістычным гістарычных наратывах XX ст. Гэта не дазволіла запачаткаваць традыцыю візіі гістарычнага мінулага ў вузка вызначаным храналагічным і сэнсавым кірунках. У літаратуры пераважаў «дзяржаўніцкі» ці «цывілізацыйны» падыход да перыядызацыі, што выключала вывучэнне эпохі Ягелонаў – эпохі пераходнай, якая знаходзілася на сумежжы і цывілізацыйных, і дзяржаваствараючых этапаў.

Такім чынам, нацыянальныя гісторыі абмяжоўваюць патэнцыял вывучэння ролі і ўскосных фактараў развіцця наддзяржаўных рэгіёнаў, іх полікультурнай прасторы, узаемаўплываў паміж рознымі этнасамі, рэлігійнымі групамі, канфесіямі, выбудовай кантактных зон унутры ахопленай прасторы і г. д. XIX і XX стст. далі магчымасць вывучэння «імперый» як надструктур і спецыфічных полідзяржаўных інкубатараў для будучых сучасных нацый. Ва ўмовах XXI ст. патрабуецца выхад на новы ўзровень вывучэння – стварэнне макрапраектаў, накіраваных не столькі на вывучэнне дзяржаўнасці, колькі на даследаванне сацыяльных і палітычных структур, тэндэнцый і працэсаў у асэнсаванні гісторыі і культуры на розных узроўнях, акумуляванне крыніц і інфармацыі аб іх у новых метадалагічных падыходах да ўжо вывучанага матэрыялу.

Падобная задача была пастаўлена заходнееўрапейскімі даследчыкамі, стымулявана інтэграцыйнымі працэсамі як у еўрапейскай палітычнай прасторы, так і ў навуковым асяроддзі. XXI ст. ва ўмовах глабалізацыі еўрапейскай навуковай прасторы раскрыла магчымасці для з'яўлення макрапраектаў, прысвечаных вывучэнню еўрапейскіх дынастый, іх «жыццёвай прасторы», узаемадзеянню з іншымі дынастыямі. Падобнае вылучэнне знайшло сваё адлюстраванне і ў масавай культуры (серыялы «Цюдоры», «Борджыя», «Велікалепны век»; мастацкія выставы «Імператар Карл IV, Богам дадзены манарх» і інш.), што падштурхоўвае да вывучэння падобных палітычных і культурных аб'ектаў.



Рэалізацыя макрапраектаў, прысвечаных Ягелонам, распачынаецца ў Польшчы разам з падрыхтоўкай і правядзеннем у музеі «Каралеўскі Замак» у Варшаве ў 1987 г. выставы «Польшча Ягелонаў» [13]. Яе навуковым кіраўніком стаў прафесар А. Гейштар, даследчык, які намагаўся як мага глыбей вывучыць эпоху, у супрацьвагу пануючым у другой палове XX ст. дзяржаўнасці і эканоміцы. Ягоныя вучні ў Варшаўскім універсітэце здолелі выйсці па-за межы фармацыйнага падыходу і ўбачыць у перыядзе ад 1386 г. па 1572 г. эпоху якасных зменаў польскай ментальнасці як на ўзроўні каралеўскай сям'і і яе атачэння, так і свецкай і царкоўнай культуры [3]. Для Вялікага Княства Літоўскага гэтага перыяду мы б прымянялі тэрмін «вестэрнізацыя», але для Польшчы такога варыянта адзінага тэрміналагічнага вызначэння ў гістарыяграфіі падабраць складана. Аднак сутнасць не мяняецца – эпоха Ягелонаў увяла Польскае каралеўства ў заходнееўрапейскую прастору.

У 1990–2000 гг. у Люблінскім каталіцкім універсітэце (Katolicki Uniwersytet Lubelski Jana Pawła II, KUL) актыўна працуе вучаніца А. Гейштара Уршуля Баркоўска (U. Borkowska). Яе праблемнае поле даследаванняў эпохі Ягелонаў уключае рэлігійнасць і царкоўны цырыманіял прадстаўнікоў фаміліі, паўсядзённую культуру двара, цырымоніі і матэрыяльную спадчыну Ягелонаў і, пераважна, Ягелонак. Большасць назапашанага матэрыялу было апублікавана ў 2011 г. у манаграфіі «Дынастыя Ягелонаў у Польшчы» [4]. Вывучэнне матэрыяльнай культуры прадстаўнікоў фаміліі Ягелонаў было падхоплена вучнямі і калегамі прафесара У. Баркоўскай. Так, пад навуковай рэдакцыяй супрацоўніцы кафедры гісторыі і культуры Ягелонскай Еўропы Люблінскага каталіцкага ўніверсітэта Агнешкі Янушак-Серадзькей (A. Januszek-Sieradzkiej) былі выдадзены зборнікі навуковых прац «Praecara stirps Jagiellonica» (2009–2011), у якіх складальнікі паспрабавалі раскрыць такія праблемы эпохі, як двор і прыдворная культура пры Ягелонах у XV–XVI стст. [5], кар'еры і сацыяльнай мабільнасці пры двары манархаў у вызначаны час [14] і, нарэшце, час кіравання апошняга манарха-Ягелона – Жыгімонта Аўгуста [15].

Падобныя праекты, рэалізаваныя ў польскіх навуковых асяродках, нягледзячы на прыцягненне да зборнікаў навуковых публікацый даследчыкаў з Літвы, Беларусі і Украіны, падкрэсліваюць усё ж такі лакальны характар даследавання польска-літвінскай спадчыны Ягелонаў.

У пачатку 2010 гг. польскія мастацтвазнаўцы і музеяведы сумесна з чэшскімі і нямецкімі партнёрамі ўключаюцца ў міжнародны праект «Дынастыя Ягелонаў у XIV–XVI стст.» («The Jagiellonian Dynasty / Dynastie der Jagiellonen. 14.–16. Jahrhundert»), які павінен быў аб'яднаць у адной

рэтраспектыўнай экспазіцыі «Europa Jagellonica. Art and Culture in Central Europe under the Jagiellonian Dynasty» здабыткі культуры Ягелонаў з усяго рэгіёна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праект каардынаваўся Гуманітарным цэнтрам гісторыі і культуры Цэнтральнай і Усходняй Еўропы Лейпцыгскага ўніверсітэта (Geisteswissenschaftliches Zentrum Geschichte und Kultur Ostmitteleuropas, GWZO). Куратарамі экспазіцыі выступілі супрацоўнікі Цэнтра Іржы Файт і Сюзана Ягер сумесна з навуковымі супрацоўнікамі «Galerie Středočeského kraje» (Кутна Гора, Чэхія), «Haus der Brandenburgisch-Preußischen Geschichte» (Патсдам, Германія), а таксама «Muzeum Narodowy» і музей «Zamek Królewski» (Варшава, Польшча). Выстава была прадстаўлена ў Чэхіі (2012), затым у Польшчы (2012–2013) і Германіі (2013), а таксама часткова экспанавалася ў новаадбудаваным Музейным комплексе «Палац вялікіх князёў літоўскіх» (Вільнюс, Літва). Кожная з частак выставы мела сваю падназву: чэшская «Здабыча срэбра і мастацтва каля 1500 года» («Silver Mining and Art around the year 1500»), польская «Дынастыі Ягелонаў – еўрапейскія манархі паміж Балтыйскім, Адрыятычным і Чорным морам» («Jagiellonian dynasty – European rulers between the Baltic, Adriatic and Black Sea») і нямецкая «Злучэнне любові і вернасці. Шлюбная палітыка дынастыі Ягелонаў з імперскімі высакароднымі фаміліямі» («The connection of love and fidelity. Marital politics of the Jagiellonian Dynasty with the imperial noble families») [8].

На выставе было прадстаўлена каля трох соцен экспанатаў з галін археалогіі, матэрыяльнай культуры і выяўленчага мастацтва з Чэхіі, Польшчы, Германіі, Аўстрыі, Славеніі і інш. Гэта выстава павінна была падсумаваць шматгадовыя пошукі і сістэматызацыю матэрыяльнай спадчыны эпохі Ягелонаў, якая была распаўсюджана ў розных дзяржавах рэгіёна і прэзентуе як палітычныя погляды дынастыі, культурнае і мастацкае асяроддзе, так і дыпламатычныя ды шлюбныя стасункі з іншымі манаршымі дварамі Еўропы. Кожная экспазіцыйная пляцоўка (Кутна Гора, Варшава, Вільнюс ці Патсдам) рабіла акцэнт на «сваёй» гісторыі Ягелонаў. Так, віленская выстава прэзентавала спадчыну дынастыі ў трох фарматах: рэзідэнцыі і іх уладальнікі; мастацкая спадчына дынастыі; уплыў эпохі Ягелонаў на развіццё розных сфер жыццядзейнасці [2].

У аснове выставы палягала канцэпцыя міжнароднага праекта, рэалізаванага ў 2000–2005 гг. у Лейпцыгскім універсітэце [2]. У межах праекта Гуманітарны цэнтр гісторыі і культуры Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (GWZO) супрацоўнічаў з вядучымі даследчыкамі з розных рэгіёнаў Еўропы і ЗША. Галоўная мэта – паказаць унікальны перыяд у гісторыі Еўропы, абумоўлены культурнай разнастайнасцю «Еўропы Ягелонаў» – спецыфічнае адзінства суіснавання рэгіянальных культур і фарміраванне агульнай традыцыі. Рэфрэнам падобных праектаў гучыць спроба адаптаваць вопыт «Садружнасці Ягелонаў» XVI ст. да сучасных рэалій трансфармацыі Еўрапейскага саюза.



Цэнтр быў заснаваны ў 1995 г. па ініцыятыве кіраўніцтва федэральнай зямлі Саксонія. Ён аб’ядноўвае каля паўсотні навукоўцаў і праводзіць даследаванні па гісторыі і культуры рэгіёна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ад ранняга Сярэднявечча да сучаснасці, пераважна зыходзячы з падыходаў кампаратывістыкі і інтэрдысцыплінарнасці [10]. Цэнтр шырока выкарыстоўвае навукова-даследчыцкі патэнцыял міжуніверсітэцкага і міжнароднага супрацоўніцтва, што дае свой плён у рэалізацыі макрапраектаў, падобных да «Studia Jagellonica Lipsiensia» [16].

Выдавецкі праект «Studia Jagellonica Lipsiensia» з’яўляўся адным з некалькіх буйных праектаў Цэнтра, прафінансаваным Федэральным міністэрствам адукацыі і навукі (ФРГ). Навуковымі кіраўнікамі праекта сталі Іржы Файт (J. Fajt), Маркус Хорш (M. Hörsch) і Эвелін Вецер (E. Wetter), а таксама пры актыўным супрацоўніцтве Ўінфрэда Эберхарда (W. Eberhard), Адама Лабуды (A. S. Labuda), Хельмута Лорэнца (H. Lorenz), Францішка Шмагеля (F. Šmahel) і інш. Серыя выданняў прэзентуе шэраг даследаванняў па мастацтвазнаўству і культурнай гісторыі, якія раскрываюць палітычныя і эканамічныя ўмовы развіцця культурнай складаючай рэгіёна, эканамічнага ўздыму, развіцця гарадской і элітарнай культуры і інш. За перыяд ад 2005 г. да 2014 г. было надрукавана 18 выпускаў «Studia Jagellonica Lipsiensia», з іх частка прэзентуе Цэнтральную і Усходнюю Еўропу пад уладай дынастыі Ягелонаў [6; 7; 9; 12]. Тут былі выдадзены як персанальныя даследаванні, так і калектыўныя працы, якія сабралі пад адной вокладкай даследчыкаў з розных частак былой Ягелонскай Еўропы.

У 2012 г. гістарычны факультэт Оксфардскага ўніверсітэта пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага даследчыцкага савета («European Research Council») распачаў пяцігадовы праект «Ягелоны: дынастыя, памяць і ідэнтычнасць у Цэнтральнай Еўропе» («The Jagiellonians: Dynasty, Memory and Identity in Central Europe»), мэтай якога з’яўляецца даследаванне дынастыі як поліэтнічнай і наддзяржаўнай з’явы ў Еўропе ў перыяд ад 1386 г. да 1596 г. Як адзначыла навуковы кіраўнік праекта доктар Наталля Навакоўска (Natalia Nowakowska), дынастыя Ягелонаў з’яўляецца своеасаблівай міжнароднай палітычнай з’явай, народжанай эпохай Адраджэння, своеасаблівымі «Цюдорамі Цэнтральнай Еўропы». Праект, на думку працоўнай групы, якая ўключае даследчыкаў з розных краін, павінен быць накіраваны на паглыбленне разумення пра каралеўскія дынастыі, іх палітычнай і персанальнай інстытуалізацыі. Праект павінен даць адказ на такія пытанні, як фарміравалася нацыянальная самабытнасць у Цэнтральнай, Усходняй і Паўночнай Еўропе і аб захаванасці Ягелонаў у гістарычнай памяці асобных народаў [17; 18].

Фармальна праца над матэрыялам па гісторыі Ягелонаў вядзецца ў некалькіх кірунках: абагульненне гістарыяграфіі і рэсурсаў (як папяровых, так і электронных) па гісторыі непасрэдна дынастыі і палітычнага ды культурнага развіцця дзяржаў, у якіх кіравалі Ягелоны. Тут на дапамо-

гу прыходзіць цеснае супрацоўніцтва англійскіх і цэнтральна- і ўсходнееўрапейскіх калег, выкарыстанне патэнцыялу тэматычных канферэнцый («Ягелоны і іх свет: каралеўская дынастыя ў другой палове XV–XVI стст.» у Асвенцыме, 16–18 кастрычніка 2014 г.; «Венгрыя Ягелонаў – новыя даследаванні і вынікі» ў Будапешце, 13–14 лістапада 2014 г. і інш.) і праектаў-папярэднікаў. Оксфардскія гісторыкі не дыстанцыруюцца ад ранейшых ініцыятываў калег з Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Значную частку супрацоўнікаў складаюць былыя выпускнікі магістарскіх праграм Цэнтральна-Еўрапейскага Універсітэта ў Будапешце, Венгрыя (Central European University in Budapest) – гэта Станіслава Кузьмова (S. Kuzmová) і Гедра Міцкунайтэ (G. Mickūnaitė).

Оксфардскі праект, на думку ўдзельнікаў, павінен стаць пляцоўкай (інтэрактыўнай, з выкарыстаннем патэнцыялу сучасных электронных сродкаў прапаганды інфармацыі) для папулярызацыі даследавання як дынастыі Ягелонаў, так і ведаў аб самім рэгіёне Цэнтральнай і Усходняй Еўропы [19]. Цяжка даваць ацэнкі праекту, калі ён яшчэ знаходзіцца ў актыўнай фазе распрацоўкі, але відавочна, што разуменне заходнееўрапейскіх навуковых цэнтраў (і Оксфард тут не выключэнне) вельмі моцна разыходзіцца з поглядам знутры рэгіёна. Варта толькі зірнуць на структуру спіса падставовай літаратуры, каб заўважыць, што ў ім не знайшлося месца ні для беларускай, ні для ўкраінскай гістарыяграфій (верагодна, з прычыны ўсведамлення заходнееўрепейскімі калегамі аб адсутнасці нацый пад падобнымі назвамі ў падручніках па гісторыі ранняга Новага часу) [11].

Такім чынам, гісторыя і гістарыяграфія Цэнтральнай і Усходняй Еўропы перажывае ў XXI ст. якасна новы ў метадалагічным і праблемным плане перыяд. Інтарэс да рэгіянальнай гісторыі падмацоўваецца з'яўленнем макрапраектаў, прысвечаных уплыву знешніх фактараў на новае, нават «глабальнае» і «стандартаванае» культурнае і палітычнае жыццё. Дынастыя Ягелонаў, якая кіравала гэтай часткай Еўропы і пакінула свой след у гісторыі такіх сучасных краін, як Польшча, Венгрыя, Чэхія, Беларусь, Літва, Украіна, Германія і інш., становіцца зноў актуальнай ва ўмовах глабальнага перагляду як гістарычнага нацыянальнага наратыву гэтых краін, так і пры аналізе такіх з'яў, як гістарычная памяць, геапалітыка, культурная трансфармацыя, рэлігійны і ментальны францір Еўропы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Исторический вестник. Том седьмой [154]: Литва, Русь и Польша XIII–XVI вв. – М., 2014. – 256 с.

2. An exhibition of the Jagiellonian dynasty that is to be held in three countries has started // [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://www.valdovurumai.lt/ru/aktualii/an-exhibition-of-the-jagiellonian-dynasty-that-is-to-be-held-in-three-countries-has-started. – Дата доступа: 20.02.2014.

3. *Borkowska, U.* Dynastia Jagiellonów w Polsce / U. Borkowska. – Warszawa: Wyd. Nauk. PWN, 2011. – 630, [2] s.





4. *Borkowska, U.* Królewskie modlitewniki: studium z kultury religijnej epoki Jagiellonów (XV i początek XVI wieku): rozprawa habilitacyjna / U. Borkowska; Katolicki Uniwersytet Lubelski. Wydział Nauk Humanistycznych. – Lublin: Redakcja Wydawnictw KUL , 1988. – 386, [1] s.

5. Curia Jagiellonica: studia z dziejów i kultury dworskiej w XV–XVI wieku. – Lublin – Sandomierz, 2009. – 163 s. (Praecara stirps Jagiellonica. Vol. I).

6. Das Königsschloss in Krakau und die Residenzarchitektur unter den Jagiellonen in Polen und Litauen (1499–1548) / von Tomasz Torbus. – Ostfildern: Jan Thorbecke Verla, 2014. – 451 s. (Studia Jagellonica Lipsiensia; Bd. 18).

7. Eine Jagiellonin als Reichsfürstin in Franken: zu den Stiftungen des Markgrafen Friedrich d. Ä. von Brandenburg-Ansbach und der Sophie von Polen / von Agnieszka Gąsior. – Ostfildern: Jan Thorbecke Verlag, cop. 2012. – 340 s. (Studia Jagellonica Lipsiensia; Bd. 10).

8. Europa Jagellonica – Art and Culture in Central Europe under the Jagiellonian Dynasty [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://en.czech-unesco.org/900_173550_europa-jagellonica-art-and-culture-in-central-europe-under-the-jagiellonian-dynasty/. – Дата доступа: 21.01.2014.

9. Hofkultur der Jagiellonendynastie und verwandter Fürstenhäuser = The culture of the Jagiellonian and related courts / hrsg. von Urszula Borkowska und von Markus Hörsch. – Ostfildern: Jan Thorbecke Verlag, 2010. – 388 s. (Studia Jagellonica Lipsiensia; Bd. 6).

10. Humanities Centre for Eastern Central European History and Culture [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.goethe.de/wis/fut/prj/for/kul/en8444184.html. – Дата доступа: 20.02.2014.

11. Key Publications on the Jagiellonians [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.jagiellonians.com/#!key-publications/cyls. – Дата доступа: 20.02.2014.

12. Künstlerische Wechselwirkungen in Mitteleuropa / hrsg. von Jiří Fajt und Markus Hörsch. – Ostfildern: Jan Thorbecke, cop. 2006. – 495 s. (Studia Jagellonica Lipsiensia; Bd. 1).

13. Polska Jagiellonów 1386–1572 / wyd. pod. red. Aleksandra Gieysztora z okazji wystawy Polska Jagiellonów 1386–1572 zorganizowanej przez Muzeum Norodowe w Krakowie w Zamku Królewskim w Warszawie. – Warszawa: Zamek Królewski w Warszawie, 1987. – 73, [6] s., [32] s.

14. Servicium et Amicitia: Studia z dziejów kariery i awansu w Polsce Jagiellonów / pod red. A. Januszek-Sieradzkej. – Sandomierz, 2011. – 200 s. (Praeclara stirps Jagiellonica. Vol. III).

15. Sigismundus Augustus Rex. Studia i szkice z dziejów panowania ostatniego Jagiellona / pod red. A. Januszek-Sieradzkiej. – Sandomierz, 2010. – 217 s. (Praeclara stirps Jagiellonica. Vol. II).

16. Studia Jagellonica Lipsiensia [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.uni-leipzig.de/gwzo/index.php?Itemid=506. – Дата доступа: 20.02.2014.

17. The Jagiellonians [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://podcasts.ox.ac.uk/jagiellonians. – Дата доступа: 15.02.2014.

18. The Jagiellonians [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.medievalhistories.com/jagiellonians-research-project-oxford-university-2014/. – Дата доступа: 15.02.2014.

19. The Jagiellonians Newsletter [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://us8.campaign-archive1.com/?u=e6df59c6c4dec896054bb5894&id=865b334bfe. – Дата доступа: 15.02.2014.


**(Дата подачи: 20.02.2015 г.)**